УДК 633.15

Г. М. ХІТРЫНАЎ, С. А. КУЗНЯЦОЎ, Р. В. ДЗМІТРЫЕВА

КУКУРУЗНЫ СІЛАС З ПАВЫШАНАЙ КОЛЬКАСЦЮ ПАЧАТКАЎ У ФАЗЕ ВАСКОВАЙ СПЕЛАСЦІ ПРЫ КАРМЛЕННІ СВІНЕЙ

У сувязі з вялікай колькасцю клятчаткі і недахопам пратэіну кармленне свіней кукурузным сіласам пакуль што не знайшло шырокага выкарыстання. У рацыёны свіней на адкорме ўводзяць не больш за 8—10% гэтага віду корму (па агульнай пажыўнасці). Значна больш магчыма даваць жывёлінам на адкорме сілас з пачаткаў з абгорткамі ў фазе васковай спеласці зярнят. У нашых папярэдніх даследаваннях [3] было вызначана, што такі сілас паспяхова замяняе каля 30% канцэнтратаў (па агульнай пажыўнасці) і сярэднясутачны прырост жывой масы атрымліваецца не менш чым 566 г.

Укараненне ў апошнія гады ў сельскагаспадарчую вытворчасць скараспелых гібрыдных сартоў кукурузы ў Віцебскай вобласці дазволіла павялічыць аб'ёмы нарыхтоўкі сіласу з пачаткаў з абгорткамі. Аднак тэхналогія ўборкі кукурузы ў фазе васковай спеласці (вільготнасць 65—70%), якая пакуль што прымяняецца ў вобласці (зернеўборачны камбайн з прыстаўкай ППК-4), не дае магчымасці збіраць толькі пачаткі з абгорткамі. Як правіла, у сабраную масу трапляе пэўная колькасць верхніх лісцяў і верхавінак раслін. Ачыстка пачаткаў ад іх патрабуе або дадатковага абсталявання (напрыклад, агрэгат Блок-700), або дадатковых затрат працы, што абумоўлівае істотнае падаражэнне корму.

Па пажыўнай каштоўнасці верхнія лісці і верхавінкі раслін нязначна адрозніваюцца ад пачаткаў з абгорткамі [1]. Але пры кармленні свіней

каштоўнасць сіласу, прыгатаванага з такой сыравіны, паніжаецца з прычыны павелічэння колькасці клятчаткі. У сувязі з гэтым вывучэнне мэтазгоднасці нарыхтоўкі такога сіласу і нормаў увядзення яго ў рацыён свіней на адкорме набывае вялікае практычнае значэнне.

У 1989 г. у эксперыментальнай базе «Межава» Віцебскага навукова-вытворчага аб'яднання па сельскай гаспадарцы з кукурузы (сорт Бема-181СВ) у фазе васковай спеласці быў нарыхтаваны сілас з сумесі пачаткаў з лісцямі і верхавінкамі раслін. Перад уборкай біялагічны ўраджай

Табліца 1. **Марфалагічны склад масы кукурузы** ($n=5$)

Маса частак кукурузы	Перад уборкай		Перад сіласаваннем	
	кг	% да агульнай масы	кг	% да агульнай масы
Цэлыя расліны	3,0	100,0	0,930	100,0
Сцёблы	1,1	36,7	0,101	10,9
Лісці	0,6	20,0	0,129	13,8
Пачаткі з абгорткай	1,3	43,3	0,700	75,3
Зерне	0,45	15,0	0,250	26,9
Храпка	0,55	18,3	0,290	31,2
Абгортка	0,30	10,0	0,160	17,2

зялёнай масы складаў 300 ц/га, выхад кармавых адзінак — 81, сырога пратэіну — 39 ц/га. Па марфалагічным складзе 43% займалі пачаткі з абгорткамі, 20% — лісці і 36% — сцёблы. Ад агульнай масы 15% прыпадала на зярняты малочна-васковай і поўнай спеласці (табл. 1, 2). Найбольш высокі выхад кармавых адзінак далі пачаткі з абгорткамі (40,5 ц/га) — у асноўным за кошт зярнят (табл. 2).

Нягледзячы на тое што маса лісцяў была меншай за масу сцёблаў (у 1,8 раза), па выхаду кармавых адзінак яны пераўзыходзілі сцёблы, бо у іх была больш высокая пажыўная каштоўнасць. У лісцях больш, чым у сцёблах, храпках і абгортках, змяшчалася сырога пратэіну і асабліва клятчаткі.

Кукурузныя пачаткі ўбіралі зернеўборачным камбайнам «Ніва» з прыстаўкай ППК-4. Гэта дазволіла ва ўбранай масе павысіць колькасць пачаткаў да 75% (табл. 1). Аднак доля лісцяў і сцёблаў заставалася даволі высокай. Перад сіласаваннем атрыманую масу дадаткова здрабнялі на агрэгаце ІРМ-50 да велічыні часцінак менш за 10 мм. Сілас рыхтавалі па агульнапрынятай тэхналогіі ў бетанаванай траншэі. Кармавую каштоўнасць гэтага віду корму вывучалі ў навукова-гаспадарчым доследзе на адкормачным пагалоўі свіней буйной белай пароды. Для правядзення доследу ўзялі тры групы жывёлін-аналагаў (кныркі) з сярэдняй жывой масай 60—62 кг на пачатак уліковага перыяду. Доследправодзілі па наступнай схеме:

Група	Колькасць жывёлін	Перыяд, сут	
		папярэдні	уліковы
Кантрольная	10	Гаспадарчы рацыён (канцэнтраты—100%)	Канцэнтраты—68%, бульба—32%
I дослед	10	Тое ж	Канцэнтраты—68%, бульба—16%, сілас—16%
II дослед	10	—»—	Канцэнтраты—68%, сілас—32%